Падтрымай "Вясну" на PATREON

У Магілёве фрылансераў судзяць нягледзячы на каранавірус

20.03.2020 **Тэгі**: адміністратыўны пераслед, свабода слова



Аляксандр Сідарэўскі і Аліна Скрэбунова. Фота: mspring.online

Фрылансеры **Аліна Скрэбунова** і **Аляксандр Сідарэўскі** не з'явіліся на працэс, спаслаўшыся на рэкамендацыі пазбягаць масавага збору людзей.

Суд Ленінскага раёна даў максімальны штраф у 50 базавых велічынь кожнаму з журналістаў за рэпартаж пра палітычнага актывіста **Станіслава Паўлінковіча,** піша mspring.online.

8 лютага Паўлінковіча аштрафавалі за ўдзел у мінскіх акцыях пратэсту супраць інтэграцыі Беларусі і Расіі ў канцы снежня 2019. Па выніках паседжання актывісту далі штраф, пра што на тэлеканале БелСАТ выйшаў адпаведны сюжэт.

Супрацоўнікі Ленінскага РАУС палічылі стварэнне рэпартажу парушэннем Закона «Аб СМІ» і пачалі адміністрацыйны працэс у дачыненні да Аліны Скрэбуновай і Аляксандра Сідарэўскага.

У якасці сведак па справе прыцягнулі дзяжурных паста аховы суда Ленінскага раёна, каля якога пра Паўлінковіча здымалі сюжэт. Сыходзячы з матэрыялаў справы, Скрэбунова ажыццяўляла інтэрв'юіраванне людзей, а Сідарэўскі выступіў у ролі аператара.

Міліцыя запатрабавала ад суда пакараць фрылансераў за «удзел у незаконным вырабе прадукцыі СМІ» і працу на тэлеканал БелСАТ без акрэдытацыі.

У адказ Скрэбунова і Сідарэўскі прадставілі ў суд свае заявы, у якіх паведамілі пра палітычна матываваны пераслед з боку сілавікоў, а таксама адзначылі некаторыя несастыкоўкі ў міліцэйскіх пратаколах. Сваю віну фрылансеры не прызналі.

Судовыя паседжанні адбыліся 19 сакавіка. Працэс па справе Скрэбуновай разглядала суддзя **Аксана Ратнікава**, па справе Сідарэўскага – **Алена Літвіна**.

Самі журналісты на суд не з'явіліся. Яны загадзя накіравалі лісты аб тым, што «з-за неспрыяльнага становішча ў сувязі з каранавірусам будзе лепш устрымацца ад масавых сходаў» і папрасілі разгледзець справы ў іх адсутнасць.

Суддзі асабліва не знерваваліся – пасля азнаямлення з матэрыяламі справы і Літвіна, і Ратнікава прынялі рашэнне аштрафаваць кожнага з фрылансераў на максімальна магчымую суму – 1350 рублёў.

Праваабаронца «Магілёўскай вясны» **Барыс Бухель**, які дапамагаў Скрэбуновай і Сідарэўскаму рыхтавацца да суда, заявіў аб цынічным і заказным характары рашэнняў.

> *– У суддзі Ратнікавай быў вопыт працэсу над журналістам Уладзімірам Лапцэвічам – тады ён прадставіў ліст з Міністэрства інфармацыі, у якім гаварылася, што калі ў фрылансера няма працоўнага дагавора або кантракту са СМІ, значыць яго нельга вінаваціць працы на яго. Яна праігнаравала той факт, што ў Скрэбуновай няма дамовы ці кантракту з БелСАТ, гэта значыць ёй фізічна нельга прышыць працу на гэты тэлеканал. Але ў яе, мабыць, нейкае сваё ўспрыманне рэальнасці*, – пракаментаваў Бухель вынік працэсу.

Што тычыцца суддзі Літвіной, то яна сваім рашэннем аб штрафе Сідарэўскаму супярэчыць сама сабе ж:

> *– І Сідарэўскаму, і Скрэбуновай ў віну ставілася "удзел у незаконным вырабе прадукцыі СМІ». Але ні ў адным кодэксе або законе няма такой фармулёўкі. Толькі «незаконны выраб», ніякага «удзелу». Літвіна колькі год таму судзіла Скрэбунову і тады яна звярнула ўвагу на такую ж фармулёўку супрацоўнікаў міліцыі і вярнула справу на дапрацоўку. Сёння ж яна цалкам задаволілася пратаколам – гэта значыць суддзя супярэчыць сама сабе. Відавочна, што абедзве справы – тыповая «палітычная» заказуха,* – лічыць Бухель.

Гвалт над свабодай слова па-магілёўску

За апошні месяц гэта ўжо другі штраф як для Скрэбуновай, так і для Сідарэўскага. Раней суд Кастрычніцкага раёна аштрафаваў фрылансераў на 50 і 20 базавых велічынь адпаведна за рэпартаж пра юбілей тралейбуснага парка. Ленінскі суд 19 сакавіка абодвум даў па максімуму.

Акрамя таго, 27 сакавіка суд чакае фрылансера Міхаіла Аршынскага, якога таксама вінавацяць у працы на тэлеканал БелСАТ.

Нарэшце, сёння, 19 сакавіка, міліцыя перадала позву для яўкі ў Кастрычніцкі РАУС яшчэ адной магілёўскай журналістцы – **Дар'і Чульцовай**. Падрабязнасці яе справы будуць вядомыя крыху пазней.

Праваабаронца Барыс Бухель са шкадаваннем канстатуе: міліцыя на ўсю моц пачала адпрацоўваць палітычны заказ у дачыненні нязручных журналістаў, пакуль увага людзей адцягнута на эканамічныя праблемы і эпідэмію каронавіруса. Рост рэпрэсій ён таксама часткова звязвае з надыходзячымі прэзідэнцкімі выбарамі.

Твитнуть







"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"



ГАЛОЎНАЕ

Рэпрэсаваны "Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску







АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

Шлях да "Вясны". Як прыходзяць да праваабароны – новы выпуск падкаста

Жыхара Смаргоні асудзілі на 1,5 года калоніі за абразу Лукашэнкі

“Не ядзернай зброі ў Беларусі!”. Як прайшоў “Чарнобыльскі шлях” у Варшаве. ШМАТ ФОТА

Затрыманні і шпіталізацыя Бабарыкі: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

"Каго вы называлі фашыстамі?" У Мінску судзяць дзіцячага паэта і выкладчыка Дзмітрыя Юртаева

Мужчыну асудзілі за ўдзел у Маршы і бойку з прычыны "палітычнай абстаноўкі" у 2020 годзе

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

"У думках з тымі, хто сустракае гэты дзень за кратамі". Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з днём нараджэння

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць







ПАРТНЁРСТВА

РАДЫЯ

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY